...вобраз гэты дастаткова традыцыйны для беларускай літаратуры. З тэксту Ваця ... як сімвал неспакою і ўнутранай дысгармоніі.

...т аўтара да ўнутранага дзеяння робіць раман псіхалагічна заглыбленым. Чорны ... робіць твор арыгінальным, выкарыстаўшы спецыфічныя паэтычныя прыёмы ...цыю фрагментаў, «двухбаковы» падыход да эпізода, паўторы з дэталізацыяй і інш.).


*Літаратура*

1. Чорны, К. Сястра / К. Чорны // Збор твораў: у 8 т. – Т. 3. – Мінск, 1973.
2. Успенский, Б. А. Поэтика композиции / Б. А. Успенский. – СПб., 2000.
3. Навуменка, І. Я. Ранні Кузьма Чорны (1923 – 1929) / І. Я. Навуменка. – Мінск, 2000.



*В. У. Коваль (Мінск, БДТУ)*


## ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ ЯНКІ КУПАЛЫ Ў ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯХ БЕЛАРУСКАЙ ДЫЯСПАРЫ

Беларуская эміграцыя і яе культурная спадчына з'яўляцца неад'емнай часткай гісторыі Беларусі. Адной з крыніц вывучэння гісторыі беларускай эміграцыі з'яўляюцца перыядычныя выданні дыяспары.

Беларускамоўныя выданні перыяду Другой сусветнай вайны сталі важнай часткай сістэмы ...цкай прапаганды, яны павінны былі ўплываць на масавую свядомасць беларусаў. ... на старонках акупацыйных выданняў асвятляўся не толькі ход баявых дзеянняў, але ...гуманітарная праблематыка. Побач з артыкуламі пра культуру, гісторыю, краязнаўства ... месца займала паэзія.

Стаўленне выдаўцоў «Раніцы» да творчасці знакамітых беларускіх паэтаў Янкі Купалы і Якуба Коласа не было нязменным. У нумарах газеты, якія выйшлі да нападу Германіі на СССР, актыўна друкаваліся іх вершы. Выдаўцы «Раніцы» асабліва часта публікавалі творы Купалы («Песня сонцу»[1], «Запела вясна»[2], «Пакінем спадчыну мы для патомкаў»[3], «На ...»[4]). Аднак паступова творы паэта зніклі са старонак выдання. Прычынай змены стаўлення «Раніцы» да аўтара стала афіцыйная забарона нямецкіх уладаў на публікацыю твораў беларускіх класікаў. Загад ад 10 лістапада 1942 г., падпісаны начальнікам генеральнага штаба (подпіс незразумелы), пастанаўляе: «Галоўны штаб узброеных сіл вермахта лістом ад 16. 07. 1942 г. прыняў рашэнне пра замоўчыванне ў беларускай прэсе твораў Коласа. Камендант ...ўнай вобласці Беларусь у лісце ад 22. 06. 1942 г. таксама падтрымаў падобны пункт ...дження»[5]. Нягледзячы на прамую забарону толькі публікацыі твораў Коласа, нямецкае ...мандаванне мела на ўвазе і творчасць Купалы. Далей у дакуменце пазначаецца, што «Баранавіцкая газета» ад 25. 10. 1942 г. апублікавала артыкул пад назвай «Характэрныя рысы беларускай літаратуры», у якім упаміналіся паэты Янка Купала і Якуб Колас. Загад заклікае выконваць распараджэнні і не рабіць падобных памылак.

Прычына рашэння забараніць нават згадваць на старонках прэсы пра паэтаў пазначаецца немцамі ў самім загадзе: «25. 06. 1942 г. з савецкіх лістовак стала вядома, што беларускі паэт Якуб Колас актыўна займаецца «антынямецкай» прапагандай»[6]. Сапраўды, Янка Купала і Якуб Колас, ад пачатку нямецкай акупацыі знаходзячыся ў эвакуацыю, актыўна працавалі: часта выступалі па радыё, сваімі публіцыстычнымі і паэтычнымі творамі падтрымлівалі

чырвонаармейцаў і партызан, заклікалі абараняць радзіму і не здавацца. У выніку забароны творчасць паэтаў знікла не толькі з прэсы Генеральнай акругі Беларусь, але і з беларускамоўных перыядычных выданняў, якія выходзілі ў Германіі.

Паражэнні нямецкай арміі, акружэнне войскаў Паўлюса пад Сталінградам прымусілі кіраўніцтва ўнесці пэўныя змены ва ўсходнюю палітыку, сярод іх – дазвол на публікацыю твораў народных паэтаў. Трэба заўважыць, што гэты дазвол распаўсюджваўся на беларускамоўную перыёдыку як на акупаванай тэрыторыі, так і ў Германіі. Разам з тым у перапісцы аддзела прэсы Рэйхскамісарыята «Остланд» з выдавецтвамі беларускіх газет, у прыватнасці ў лісце ад 21 кастрычніка 1943 г., дазвол на публікацыю твораў Купалы і Коласа мае абцякальную фармулёўку: «У адказ на Ваш тайны ліст ад 12 кастрычніка 1943 г. паведамляю Вам, што ў газетах, якія выходзяць у Генеральнай акрузе Беларусь, імёны Беларускіх пісьменнікаў Коласа і Купалы больш не ўспаміналіся. На публікацыі ў літоўскай прэсе, нават калі гаворка ідзе пра беларускія газеты, мы ніякага ўплыву не маем»[7]. Вынікам такой пазіцыі немцаў стала адсутнасць твораў беларускіх класікаў у перыёдыцы і пасля 1943 г. Творы Янкі Купалы зноў з'явіліся на старонках перыядычных выданняў толькі ўлетку 1944 г. Вершы «На сход!», «Паўстань!», «За свабоду сваю» былі надрукаваныя ў № 4 – 6 за 1944 г. у часопісе СБМ «Жыве Беларусь!»[8], а купалаўскія «Не загаснуць зоркі ў небе...» з'явіўся ў тым жа выданні ў наступным нумары[9]. Сувязь такіх перамен з падзеямі на фронце відавочная. Акрамя таго, публікацыі Янкі Купалы напрыканцы вайны не ўяўлялі пагрозы для нямецкіх прапагандыстаў, бо ў 1942 г. паэт трагічна загінуў у Маскве.

Першае асэнсаванне жыцця і творчасці Янкі Купалы ў пасляваеннай прэсе беларускіх эмігрантаў з'явілася ў вялікім артыкуле на старонках адной з самых папулярных газет – «Бацькаўшчына». Артыкул «Янка Купала – наш!»[10] быў змешчаны ў газеце з нагоды шостай гадавіны з дня смерці паэта. Аўтар які падпісаўся псеўданімам «Спадзявайла», пераконваў чытачоў, што Купала стаў ахвярай абставінаў і рэжыму. «Суд гісторыі, "суд цяжкі" над Янкам Купалам пачаты ім самім, самім-жа выкананы й смяротны прысуд. Але апошняе – толькі фізічнаму Купалу... Трэба ўмець ненавідзець – але ніколі не ахвяру, а ката! – трэба ўмець і разумець і выбачаць ды дароўваць»[11]. У дадзеным артыкуле Купала стаў не савецкім і варожым, а блізкім эмігрантам паэтам, таму яго творы пачалі актыўна публікавацца ў прэсе дыяспары. У нумарах газеты за 1952–1953 гг. па частках друкуецца драма «Раскіданае гняздо», гэтак жа па частках – п'еса «Тутэйшыя» (1953). Постаць Янкі Купалы паўстае перад чытачамі чыстай і трагічнай, як паэта са зламаным лёсам. Аўтар канстатуе: «У Менску пастаўлены помнік найвялікшаму беларускаму паэту Янку Купалу»[11].

Такім чынам, пасля вайны творы Купалы актыўна друкуюцца не толькі ў БССР, але і за мяжой краіны, разглядаюцца таксама асобныя моманты яго біяграфіі і мастацкай спадчыны.

*Літаратура*


1. Раніца. – 1939. – № 3.
2. Раніца. – 1940. – № 12 – 13.
3. Раніца. – 1940. – № 2
4. .Раніца. – 1940. – № 8 – 9.
5. НАРБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 981.
6. НАРБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 981.

7. НАРБ, ф. 370, воп. 1, спр. 1284.
8. НАРБ, ф. 385, воп. 2, спр. 13.
9. НАРБ, ф. 385, воп. 2, спр. 13.
10. Бацькаўшчына. – 1948. – № 23.
11. Бацькаўшчына. – 1953. – № 3.

*В. І. Козіч (Мінск, БДПУ)*

# НОВАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ СІТУАЦЫЯ: ПОШУКІ ЭСТЭТЫЧНАЙ ЗМЯСТОЎНАСЦІ

Свет прыгожага пісьменства заўсёдна жыве пошукамі новай эстэтычнай змястоўнасці. Сённяшні твар нацыянальнай літаратуры – гэта адначасна прысутнасць пісьменнікаў розных творчых пабыткаў, розных пакаленняў.

Сітуацыя ў літаратурным працэсе з пэўнай перыядычнасцю становіцца «новай»: нараджаюцца якасныя змены, «іншая» проза, паэзія, драматургія. Мастацкі свет літаратуры пачатку XX ст. абжывае лірычны герой Я. Купалы, Я. Коласа, Цёткі, А. Гаруна, М. Багдановіча, … Лістоўскага... Ён – чалавек, поўны годнасці, адчувае нацыянальную адметнасць, імкнецца стаць муляром Беларускага Дому. Героямі свайго часу бачацца сёння інтэлігенты-адраджэнцы на старонках кніг М. Гарэцкага, Я. Коласа. З'яўленне паўнавартаснай прозы М. Багдановіч звязваў з глыбокай псіхалагічнай распрацоўкай характару, з багатым духоўным зместам, …бдуленым «нуднасці і бяскрыласці» (арт. «Глыбы і слаі»). Максімаў геній паказвае беспамылковы шлях псіхалагічнага раскрыцця ўнутранага свету героя для нацыянальнай прозы. Шлях, які на поўную моц заявіць пра сябе ў творах К. Чорнага, М. Зарэцкага, пазней у І. Мележа, В. Быкава, .Пташнікава, В. Казько...

Мастацкая літаратура, якая развіваецца па сваіх унутраных законах, усё ж залежыць ад грамадска-палітычных абставін. Творчасць паэтаў-класікаў П. Броўкі, А. Куляшова, М. Танка, П. Панчанкі ўмоўна для зручнасці дзелім хоць бы на тры перыяды: паэзія 1930-х гадоў (даваенны перыяд), гадоў Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенных дзесяцігоддзяў.

У 30-я гады, калі пануе метад сацыялістычнага рэалізму, калі дзяржава кантралюе не толькі ідэалогію, але і формы мастацкай творчасці, М. Танк жыве і працуе ў Заходняй Беларусі. Духоўная сталіца Вільня на пэўны час стала эпіцэнтрам літаратурна-мастацкага руху польскай і заходнебеларускай літаратуры. Нягледзячы на вызвольна-нацыянальную барацьбу за уз'яднанне беларусаў у адзінай дзяржаве, муза М. Танка мае магчымасць творчага росту ў асяродку такіх польскіх пісьменнікаў, як будучы лаўрэат Нобелеўскай прэміі Ч. Мілаш, Г. Дамбінскі, Е.Путрамант, Е.Загурскі... Гэта спрыяла паўнакроўнаму развіццю творчай індывідуальнасці М. Танка, далучэнню яго да еўрапейскай культуры.У новай літаратурнай сітуацыі малады на той час паэт адчувае крызіс старых паэтычных канонаў, традыцыйнай вобразнай сістэмы, пра што сведчаць дзённікавыя запісы «Лісткоў календара».

Чалавечнасць, гуманістычная канкрэтнасць, непарыўнасць сувязей з жыццём Радзімы – вызначальныя эстэтычныя арыенціры вялікага паэта XX ст. на ўсіх этапах яго жыццёвага і творчага шляху. Перагортваем старонкі танкаўскіх зборнікаў «Праз вогненны небасхіл», «У дарозе», «Мой хлеб надзённы», «Глыток вады», «Хай будзе святло», «Дарога закалыханая жытам», «Збор калосся», «Errata». За імі – размова грамадзяніна і філосафа пра Беларусь